# «ВЕЦЕР З УСХОДУ ПАХ РАДЗІМАЙ…»

## З успамінаў В. Д. Кузі, С. В. Пісанкі, Л. Г. Курмель, Н. П. Мелянец, З. Р. Марцуль, М. Г. Ткачук, в. Эймінаўцы

У вайны не адзін твар. На гэтых жанчын з Эймінаўцаў Вялікая Айчынная глядзела вачамі чужыны. Страху. Голаду. Не па гадах цяжкай працы. У Нямеччыне пад прымусам парабкавалі трыццаць, як не болей, жыхароў гэтай вёскі. Цяпер з тых трыццаці засталіся толькі яны: Вольга Дзмітрыеўна Кузя, Соф'я Вікенцьеўна Пісанка, Любоў Георгіеўна Курмель, Надзея Піліпаўна Мелянец, Зінаіда Раманаўна Марцуль, Марыя Георгіеўна Ткачук. Усе яны ведаюць, помняць, што значыць няволя і туга па радзіме.

Любоў Георгіеўна і Марыя Георгіеўна - сёстры, іх бацькоў забралі на чужыну разам з пяццю дзецьмі: старэйшаму сыну, Зюніку, было шаснаццаць, Любе - пятнаццаць, Івану - чатырнаццаць, Лёніку - трынаццаць, а Марыі няпоўных адзінаццаць.

Соф'я Вікенцьеўна Пісанка таксама была вывезена ў Германію з бацькамі, братамі і сёстрамі. Ехала дзяўчынка на руках у маці. Было ёй…восем месяцаў. З той пары яна, вядома, не памятае нічога. Падрастаючы, даведвалася пра сваё маленства ў няволі з расказаў радні і аднавяскоўкі Вольгі Кузя, якая была ў адным вагоне з маленькай Сонечкай.

Гэтыя жанчыны - жывыя сведкі страшнай вайны. Як і ветэранаў, як і тых, хто пакутаваў у фашысцкіх канцлагерах, іх, на жаль, усё менш. Таму ўспаміны гэтых людзей пра перажытае - на вагу золата. Магчыма, мы нават і не ўяўляем сабе сёння, наколькі яны важныя і патрэбныя маладому пакаленню, гэтыя ўспаміны…



**На здымку (злева на права)*:* сядзяць** ***С. В. Пісанка, М. Г. Ткачук, Н. П. Мелянец;*** **стаяць** ***З. Р. Марцуль, Л. Г. Курмель, В. Дз. Кузя.***

Марыя Ткачук:

- На хутары мы жылі. Да-лё-ё-ка ад вёскі, вёрст мо з пяць. Аж пад самюсенькім лесам. Бывала, партызаны з яго выходзілі. З калодзежа вады пап'юць, абсушацца, маці іх пакорміць, чым мае. За гэта солтыс і заўдаў немцам нашу сям'ю. Не казнілі, то ў Нямеччыну ўсіх забралі.

Месяц люты на дварэ трашчаў марозамі. А снегу таго намяло! І вось адным днём глядзім: каля хутара нашага падводы. Немцы і паліцаі з аўтаматамі, солтыс. «Збірайцеся, - крычыць ён з парога. - Каб праз паўгадзіны былі гатовы ехаць у Германію!». Мама ў плач: «За што гэта нас? Мы з гаспадаром няграматныя, дзеці малыя - якія з іх работнікі?». Потым, пасля вайны, яна не раз успаміналa, як солтыс працадзіў праз зубы: «Туды вам і дарога. Мне б вас больш не ўбачыць».

Тры сям'і тады, у снег і ў сцюжу, з хутароў вывезлі. У Бераставіцы тры дні ў гета трымалі, пакуль людзей з вёсак назбіралі. А мы - з адной булкай хлеба. Мама толькі-толькі цеста расчыніць сабралася, а тут - забіраць нас прыехалі. «Памрэм галодныя, усе вымрам,» - прычытала яна. Солтыс спыніўся каля свае хаты і пабег нечага ў хлеў. А жонка яго, добрая душа, вынесла нам пад палою бохан хлеба.

На станцыю людцоў назвозілі - як селядцамі тыя вагоны набілі. Каб і хацеў упасці - не ўпадзеш. Паставілі ў кутку выварку- уборную, значыць. І поезд паехаў. Людзі хто плакаў, хто маліўся - ці ж хто верыў, што вернецца? Есці хацелася. А ўжо піць! - губы ад смагі распухлі. Прыязджаем на станцыю, і бацькі напраміль Бог просяць кожнага, хто праходзіць міма, каб жменьку снегу кінуў - дзецям лізнуць.

Тры дні так і ехалі. А ў Кёнінгсбергу выгрузілі нас. Помню, як усе стаялі ўздоўж дарожкі - справа і злева. А па дарожцы той старыя немцы з кульбакамі хадзілі: выбіралі парабкаў. На нас ніхто кульбакай не ўказаў. Хацеў адзін тату і брата ўзяць, але мы ўсе так моцна плакалі, так ушчаперыліся ў іх, што немец пайшоў далей. Урэшце, аказаліся ў багатай фрау, яна мела пяць двароў, многа зямлі, а парабкаў - дзве сотні. І гастарбайтары, і ваеннапалонныя французы, бельгійцы, палякі, рускія. Іх у гумне вартавалі з сабакамі, а ў полі яны аралі і касілі пад дулам аўтамата. З рускіх здзекваліся найгорш, што не так - прыкладам па галаве. Не раз бачыла, як з поля ехалі акрываўленыя. Зімавалі тыя палонныя ў халодным гумне. У нас хоць печка-буржуйка была. Драўляныя нары, на іх - салома.

Так жылі зіму, лета, яшчэ адну зіму аж да вясны. Пакутавалі, а не жылі. Ці ж у мяне дзяцінства тое было? Немцы, аўтаматы, сабакі. Штодня страх: што будзе заўтра? Помню, як збілі гумаю аднаго хлопчыка. Там чыгунка была. І ён з цікаўнасці прыдумаў пакласці на рэльсу камень. Хацеў паглядзець, ці раздушыць яго поезд? Немцы згледзілі. Ах, Божа мой, ледзьве выхадзілі бацькі малога…

Я моцна-моцна баялася немцаў. У той Германіі і пачала так марнець, што стала як цень. Неяк парабак-украінец сказаў маме: «Баюся, каб хоць вы завезлі сваю малую дахаты жывою». Мама і сама баялася, усё плакала, перажывала. Нам давалі картачкі на харчы, мы іх у горадзе атаварвалі. Мама падружылася там з немкай, нехта з бацькоў у яе палякам быў. Мяняла ў яе цукар на крупы. Дык тая жанчына пільна ўгледзелася ў мяне і спытала па-польску: што з вашай дзяўчынкай? А потым сказала, што ў яе ёсць знаёмы ваенны доктар, і яна пакажа цішком мяне яму. Помню, як мы з мамай уцяклі ў горад. Як яна загадала маўчаць у доктара. Як той доктар-немец доўга выстукваў, выслухоўваў мяне. А потым, як сказала маме тая немка, здзівіўся: «Што ж перажыло гэтае дзіця? Па-мойму, нешта такое, што і дарасламу не па сілах». І выпісаў лекі. Я пачала пакрысе папраўляцца, і да якіх во, бачыце, год дажыла.

Любоў Курмель:

-Я старшая за сястру Марыю, мне тады пятнаццаць было. Больш што бачыла, лепей што панімала. Яна, бедненькая, так баялася ўсяго, так ёй было страшна - усё чужое, чужыя людзі, вокрыкі па-чужому. Так марнела, аплывала як свечка. Мы, падшпаркі, яксьці прыстасоўваліся да таго страху. А як бацькі нашы выжылі тыя гады ў Нямеччыне, то й не ведаю. За ўсіх нас у іх сэрца балела, нават не ведалі, адкуль тую бяду ждаць. Івану чатырнаццаць было. З пленнымі растрэсваў ён гной пад лесам. А поле здзірванела, трава высокая ўзрасла. У нас дома, бывала, такую спальвалі. Адкуль ён тыя запалкі ўзяў? Падпаліў траву. Агонь і пайшоў гуляць, прыхапіў некалькі маладых сасонак… Івана схапілі, у горад даставілі. Там дапытвалі: «Якія камуністы навучылі лес спаліць?».

А яшчэ так было. Меншы брат паганяў коней,-іх абучалі, - і кепска нешта яму зрабілася. То так бізуном немец-наглядчык два разы перацягнуў, што малы ледзь жывы застаўся. «Не прытварайся!!!»- крычыць. Ці ж лёгка маме было перажыць такое? Каралі моцна за ўсё. Нас адразу за рускіх лічылі, а над імі надта ж здзекваліся. Ледзь што - 25 бізуноў ды яшчэ пакладуць на жалезную бочку, каб лацвей было біць і мацней балела.

Многае помніцца. Колькі часу прайшло, а яно як перад вачыма. Акопы ганялі капаць. Гэта ўжо пад Гдыняй было. Немцы ўцякалі і нас з сабой везлі. Маці скібачку хлеба тоненькую намажа маргарынай, і гэта яда на цэлы дзень. За вёрст дваццаць вязуць. Мароз, зямлю тую і ломам не ўбіць, а норму - зрабі. Я ад той скібачкі і мелася па крышачцы доўга адкусваць, а з’ядала за тры разачкі…

Помню яшчэ, як мама там, у фрау, хлеб нам пякла. Муку давалі. Дык хлеб мама і палонным цішком пякла - яны ў кішэні са склада

гароху ўсыплюць, або картошыну ці бурак украдуць у полі. Прыносяць: спячы, хазяйка, з гэтага ўсяго і нам хлеба.

Потым прыспасобіліся самі пячы. З бляшанкі ад кансерваў, што Чырвоны Крыж французам і бельгійцам дастаўляў, зрабілі млынок. І печ зрабілі патаемна. Але ўсё гэта знайшлі немцы, раскідалі.

Расказваць можна без канца. Без малога дзевяцьсот дзён мы былі ў няволі той. Гэта не жартачкі…

Зінаіда Марцуль:

- Бауэр, у якога я працавала, гаспадарку меў невялікую. І парабкаў было ўсяго двое - я і мужчына з Польшчы. А работы - хоць задушыся! У пяць раніцы тачкай ужо вязу бідоны на выган. Падаіла кароў - і ў поле ці ў агарод. А рукі ныюць, пухнуць, вядома, семнаццаці яшчэ не мела. Так дахаты хацелася - здаецца, адну бульбу ела б, абы толькі у роднай старонцы…

Соф’я Пісанка:

- Што я магу расказаць? Тое, што чула ўжэ пасля вайны ад мамы, ад таты, сясцёр і брата. Сям’я ў нас вялікая была: сямёра дзяцей. Насця - старэйшая, 20 год мела. Яе ў 42-ім у Германію бралі. Але ўцякла неяк, потым хавалася ўсё. Ну то і прыехалі зімою, у лютым, падводамі. А мароз, а снег - коням пад жываты! Жэнік пяць год меў, як быў на той час у цёткі ў Бераставічанах, там, дзякаваць Богу, і застаўся. Аляксандру адзінаццаты ішоў, ён ужо падпаскам быў. Таксама ў сваякоў жыў - зіму яго глядзелі, каб летам з пугай хадзіў. Так што з бацькамі нас, дзяцей, пяцёра паехала. Мы на хутары пад самым лесам жылі, то мо нас забралі і з-за таго, што партызаны часам прыходзілі.

Мама потым усё ўспамінала, які гэта жах быў - ехаць невядома куды з малым дзіцём на руках. У Бераставіцкім гета я моцна захварэла. У вагоне ехала, не адкрываючы вочак. Ніхто й не думаў, што выжыву. Волька Кузя расказвала, што, едучы на станцыю, мама, тулячы мяне да грудзей, не сціхала плакаць. «Ах, Божа мой, як маё гэтае дзіцятка ўжо мае ўмярці, то хай лепей цяпер памрэ,- прычытвала ў страшным адчаі і ўжо ледзь не ў бяспамяцтве.- Хоць у сваёй зямельцы пахавала б. А куды ж яго вязу, а на якія ж гэта пакуты?»…

- І тут ты ўзяла і праглянула вочкамі, усё роўна як панімала штосьці,- расказвала Волька. - Бабы, што ехалі на возе, і гледзячы на ўсё гэта, таксама плакалі, тут як акрыялі: ціха, маці, маці не прычытвай, а мо і выжыве дзіцятка?!

Колькі ні жыла мама пасля вайны, не магла ўспамінаць пра тое. Зойдзе якая гутарка - плача.

У Нямеччыне ножкамі я доўга не пайшла. Адно што марная была, слабая, а другое - на зямлю і не пускалі, бо не было ў што абуць-адзець.

Не ўсе мы ўцалелі ў той чужыне. Захварэў і памёр мой брацік…

Бацькі расказвалі, што і дома, куды вярнуліся ў 45-м, было ой як цяжка. Хата сустрэла пустая, з выбітымі вокнамі. Ні зярнятка, ні бульбінкі. Маці хадзіла з намі, малодшымі, жабравала…

Вольга Кузя:

- Ад той Нямеччыны ратаваліся, як маглі. Бацька наш хворы быў, а нас дзяцей - шасцёра. Брата старэйшага бралі. То маці ў ноч перад гэтым натаўкла курынай слепаты і ногі ёю абмыла. Тыя ногі і параніла - а немцы ж баяліся ўсякай заразы! Не ўзялі тады яго. А ўзімку мяне забралі. Шаснаццаць мела - дзіця яшчэ. А рабіла як дарослая: і жала, і гной выкідвала, і акопы капала. Папаела таго супу з бручкі. А найгорш было без роднай старонкі. Бывала, узіраемся вечарам на месячык, на зоркі і думаем: а мо і родныя нашы на іх у гэты час глядзяць? Не паверыце, вецер з усходу нюхалі - здавалася, ён пах радзімай.

Надзея Мелянец:

- Мы ўдзвюх з Зосяй Конік у Нямеччыне той былі. У Кёнігсбергу на ваенным заводзе: там выраблялі замкі да арудзій і палявыя кухні. Мы падсобніцамі былі - наносімся таго жалеза, то з ног валімся. А елі што? - у абед давалі кавалачак хлеба і талерку супу, і гэта ўся яда за дзень. Горад нашы войскі доўга не маглі ўзяць, усё бамбілі. Завод на ўскраіне, то мы ў поле ўцякалі. Жах які быў! Горад гарыць, дамы валяцца. Мы й не надзеяліся, што ў жывых застанемся. А мой брат дахаты і не вярнуўся - загінуў у той Нямеччыне...

Марыя Драпеза, в. Эймінаўцы,
2009 год.